


## У НУМАРЫ


| **Навіны** | **Навуковая праца** |
|---|---|
| Святочны май: нашы падзеі<br>Свята беларускай маляванкі. Музей адкрыўся<br>Наша выстава: чарговы Праект у межах серыі “Этнаграфіка рэчавіду” | Заслаўе ў беларускай культуры<br>Заслаўе і яго жыхары паводле інвентара 1698 г. |


## Навіны

### Святочны май: нашы падзеі

Гэты май выдаўся для музея-запаведніка асабліва запамінальным і святочным, насычаным як традыцыйным, так і новым. Наш калектыў традыцыйна прыняў удзел у святкаванні Дня Перамогі ў Заслаўі: супрацоўнікі музея-запаведніка былі ў святочнай калоне, прымалі ўсіх ахвочых наведаць нашы экспазіцыі на музейна-выставачным і этнаграфічным комплексе; уваход для наведвальнікаў быў бясплатным. Таксама май традыцыйна поўніцца вялікай колькасцю арганізаваных дзіцячых груп, што прыязджаюць на звычайныя і тэатралізаваныя экскурсіі. У навучэнцаў сканчаецца вучэбны год, настаўнікі і бацькі імкнуцца зрабіць для іх цікавы і пазнавальны адпачынак, які знаходзяць у музеі-запаведніку. Асаблівай папулярнасцю ў гэты час карысталіся тэатралізаваныя экскурсіі *“Падарожжа ў зачараваны лес” (у Дзіцячым музеі міфалогіі і лесу)* і *“У госці да млынара” (на этнаграфічным комплексе)*. “Геаграфія” нашых гасцей вельмі разнастайная: *Мінск, Барысаў, Слуцк, Стоўбцы, Нясвіж, Смалявічы, Віцебск* і гэтак далей.

Навіной стала адкрыццё **Музея беларускай маляванкі**, якое было вельмі чаканым як з боку супрацоўнікаў музея-запаведніка, так і з боку шырокай грамадскасці. 18-га мая адбылося ўрачыстае адкрыццё для

афіцыйных асоб, пры якім прысутнічалі прадстаўнікі разнастайных дзяржаўных СМІ, у тым ліку – тэлеканал “АНТ” (*рэпартаж рыхтаваў Аляксандр Мацяс*). Кіраўніцтва прадпрыемства “Марк Фармэль” падаравала ў калекцыю дываноў-маляванак нашага музея-запаведніка вельмі каштоўны арыгінальны дыван аўтарства Язэпа Драздовіча, які быў набыты ў прыватнага калекцыянера. Пра падзеі 18-га мая чытайце больш падрабязна ў матэрыяле “Свята беларускай маляванкі. Музей адкрыўся”.



*Музыка, фальклярыст і былы супрацоўнік нашага музея-запаведніка – Уладзімір Хрыставіч Бярбераў у экспазіцыі Музея беларускай маляванкі*



*Падарунак ад мастака Віктара Барабанцава – даўняга сябры музея-запаведніка*

19-га мая была праведзена акцыя-творчая сустрэча “Музй беларускай маляванкі. Плён і пожня ў сэрцах...” у межах якой гучала музыка і спевы (*граў на дудзе Уладзімір Бярбераў, спявала Наталля Матыліцкая*), гучалі пажаданні ўдачы і росквіту, дарыліся падарункі (*мастак Віктар Барабанцаў падараваў дыванок-маляванку, якая бытавала ў яго радні*), праводзіліся тэматычныя экскурсіі.







*Афішы да Ночы музеяў-2023*

Гэтым жа днём на базе Музея беларускай маляванкі была праведзена музейная акцыя да Ночы музеяў-2023 “Музей Беларускай маляванкі / Discovery — стань першым!”, у якой нас падтрымалі сапраўдныя таленты (*музыкі, майстры, педагогі*), дзякуючы якім свята атрымалася, насамрэч, яскравым і шматгранным.

Трохгадзінная праграма была насычана разнастайнымі лакацыямі: адначасова працавалі дзіцячая, творчая, музычная і іншыя зоны. Дзякуючы падтрымцы Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў, а таксама Заслаўскай сярэдняй школы № 2 імя М.К. Пуцейкі наведвальнікі Ночы музеяў — 2023 у Заслаўі змаглі ўбачыць яскравыя і шчырыя дзіцячыя работы, створаныя ў тэхніцы маляванага дывана.

Сапраўдны ажыятаж ў гасцей Музея беларускай маляванкі выклікалі лекцыі і адукацыйныя гутаркі з супрацоўнікамі музея-запаведніка. Ігар Кандратовіч, старшы навуковы супрацоўнік Запаведніка, распавёў пра беларускія маляваныя дываны, гісторыю, кантэкст, стварэнне і іх далейшае

“жыццё”. Аляксандр Рак, галоўны захавальнік фондаў, падзяліўся “таямніцамі” гісторыі збірання, заснавання і стварэння самай вялікай калекцыі маляваных дываноў у нашай краіне, пра экспедыцыі і пра народную памяць аб інсітных мастаках. Ксенія Сямашка, намесніца дырэктара па навуковай рабоце, распавяла пра дэтэктыўныя гісторыі вышуку і даследавання маляванага дывана Язэпа Драздовіча, сямейныя таямніцы і “незвычайныя гісторыі” пра атрыбутаванне маляванак.

Увесь вечар на музейным дворыку новага музейнага аб’екта Запаведніка гучала музыка: яскравымі фарбамі і звонкімі галасамі адкрылі музейнае свята маленькія артысты Дзіцячага тэатра спеваў “Пацеркі” пад кіраўніцтвам Ірыны Лебедзевай (Заслаўскі гарадскі дом культуры). Далей гучала нечаканая імправізацыя і знаёмая класіка на скрыпцы ў выкананні Аляксандра Баравіка (выкладчык Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў). Завяршыў гэтае свята выступ інструментальнага ансамбля “International band” пад кіраўніцтвам Мохава А.С. (Белдзяржуніверсітэт культуры і мастацтваў).







*Афішы, прымеркаваныя да святочных падзей у Музеі беларускай маляванкі*

За гэты поспех мы шчыра ўдзячны ўсім тым, хто нам дапамагаў у арганізацыі Ночы музеяў, а таксама – нашым гасцям, якія падзялілі з намі радасць свята і памножылі яе на свой бадзёры настрой і добрыя зычэнні. Так наш новы аб'ект – Музей беларускай маляванкі стаў жыць сваім па-сапраўднаму музейным і творчым зместам, які працягвае раскрывацца і

цяпер, бо інтарэс да яго з боку наведвальнікаў працягвае заставацца даволі значным.



*Экскурсію ў Музеі беларускай маляванкі вядзе Аляксандр Канстанцінавіч Рак*



*Экскурсію ў Музеі беларускай маляванкі вядзе Інэса Віктараўна Сабалеўская*

Музей беларускай маляванкі стаў выдатнай базай для працы студэнтаў БДПУ і гістарычнага факультэта БДУ, для паглыблення іх практычных ведаў у галіне традыцыйнай народнай беларускай культуры. Студэнты атрымалі рэальную магчымасць пабачыць сваімі вачыма дываны-маляванкі, якія раней ім маглі быць вядомымі толькі з альбома-каталога, што рыхтаваўся музеем-запаведнікам у 2005 г., а таксама і тыя маляванкі, што ў гэты альбом не ўвайшлі.

## Свята беларускай маляванкі. Музей адкрыўся

Святкаванне Міжнароднага дня музеяў 18 мая 2023 года будзе ўпісанае ў гісторыю музея-запаведніка “Заслаўе” і, не пасаромімся заявіць, у гісторыю музейнай справы Беларусі адкрыццём новага музейнага аб’екта — адзінай музейнай прасторы, прысвечанай маляваным дыванам, — Музея беларускай маляванкі.

Адкрыццё музейна-выставачнай прасторы менавіта ў гэты дзень стала сапраўдным падарункам для некалькіх пакаленняў супрацоўнікаў музея-запаведніка, калег-музейшчыкаў, даследчыкаў гісторыі і мастацтва Беларусі, жыхароў Заслаўя і ўсіх тых, хто на працягу некалькіх гадоў сачыў за стварэннем музея.

Апоўдні 18 мая Музейны дворык па вуліцы Дачная, д. 13 напоўніўся гасцямі і ўдзельнікамі ўрачыстай цырымоніі адкрыцця экспазіцыі. Варта заўважыць, што раздзяліць гэтую радасць з намі прыбылі калегі — прадстаўнікі музейных установ Мінска, кіраўнікі і супрацоўнікі ўстаноў адукацыі Заслаўя, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый горада, начальнікі аддзелаў Мінскага райвыканкама, прадстаўнікі Заслаўскага гарвыканкама.



*Выхаванцы харэаграфічнага аддзялення Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў*

Нягледзячы на прахалоднае надвор’е, яркі і святочны настрой, напачатку мерапрыемства, стварылі сваім танцам выхаванцы харэаграфічнага аддзялення Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў. Іх шчырыя ўсмешкі ўпрыгожылі цырымонію адкрыцця.




*Вітальнае слова ад першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Таццяны Хмель*




*Старшыня пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, член Савета Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Генадзь Давыдзька*

Далей прагучалі вітальныя словы ад ганаровых гасцей: першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага

аблвыканкама Таццяны Хмель, намесніка старшыні Мінскага райвыканкама Ірыны Ціхонка, старшыні пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ, члена Савета Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Генадзя Давыдзькі, старшыні Заслаўскага гарвыканкама Святланы Карташовай, дырэктара ААТ “Марк Фармэль” Андрэя Кулыгіна, прадстаўнікоў духавенства айца Мікалая і ксяндза Дзмітрыя.

Вялікай нечаканасцю для прысутных сталі падарункі музею.




*Ірына Ціхонка і Юрый Шкурскі*




*Андрэй Кулыгін, Святлана Карташова, Юрый Шкурскі*

Ва ўрачыстай абстаноўцы Ірына Ціхонка перадала ў калекцыю запаведніка сямейную рэліквію — маляваны дыван 1950-х гадоў , які доўгія гады ўпрыгожваў сцены бацькоўскага дома на поўдні Гомельшчыны.

Андрэй Кулыгін урачыста ўручыў бясцэнны падарунак — маляваны дыван Язэпа Драздовіча, які зойме пачэснае месца ў калекцыі музея-запаведніка.



*Святлана Карташова, Ірына Ціхонка, Таццяна Хмель, Юрый Шкурскі*

Па традыцыі цырымонія адкрыцця завяршылася перараданнем чырвонай стужкі. Музей адкрыў свае дзверы і прыняў сваіх першых наведвальнікаў!



*Айцец Мікалай праводзіць цырымонію асвячэння музея*

А ў холе музея музычнай кампазіцыяй сустракаў гасцей ансамбль скрыпачоў Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў пад кіраўніцтвам Аляксандра Баравіка. Гукі скрыпкі і мелодыі кампазіцый ліліся па залах новага музея, напаўняючы яго жыццём.



*Ансамбль скрыпачоў Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў пад кіраўніцтвам Аляксандра Баравіка*

Цырымонія адкрыцця працягнулася невялікім пагружэннем у працэс стварэння экспазіцыі — на экране тэлевізара ўсе жадаючыя змаглі ўбачыць відэаролік аб пераўтварэнні былога Дома дзіцячай творчасці ў Дом маляванкі.






*Алена Кіш (Дубкова Вольга, кіраўнік тэатральнага гуртка філіяла “Навасельскі цэнтр культуры і адпачынку”) і Язэп Драздовіч (Генріх Герман, загадчык сектара работы з дзецьмі і моладдзю філіяла “Заслаўскі гарадскі Дом культуры”)*

А ў зале “Дзівосны свет Алены Кіш” усіх чакала Алена... Натхнёная і адначасова сумная, наіўная мастачка расповедам пагрузіла гасцей імпрэзы ў свой таямнічы і зусім няпросты свет. Радасць і сум, творчасць і натхненне, поспех і забыццё — дзіўны свет Алены Кіш.

Выразным і гучным голасам вітаў у суседняй зале дзядзька Язэп — “*Вечны вандроўнік*”. Язэп Драздовіч падзяліўся сваімі развагамі пра жыццё, месца і ролю мастака, яго асветную місію і, вядома ж, расказаў аб маляваных дыванах. Цяпер гэта не проста маляванкі — гэта гісторыі людзей, сем’яў і эпохі, застылыя ў тканкавых палотнах з “*самаробнымі таннымі фарбамі ды на пакосце*”, як пісаў Драздовіч у дзённіку.

“*...Праца кончана. Закончана на папраўках. Дзяўчаткі-сёстры цешуцца: “Цяпер нашая хата — музей…”* — такімі словамі Драздовіч скончыў запіс у дзённіку, пакінуты пасля стварэння аднаго з дываноў, які дэманструецца ў музеі.

…*Цяпер наша хата-музей...* Цяпер наш музей — Хата маляванкі.

З прадметамі, якія дэманструюцца ў зале зменнай экспазіцыі, і інтэрактыўнымі зонамі пазнаёмілі наведвальнікаў галоўны захавальнік фондаў Аляксандр Рак і старшая навуковая супрацоўніца Інэса Сабалеўская, шматгадовая праца зрабіла грунтоўны ўнёсак ў рэалізацыю праекта па стварэнні экспазіцыі.

У гэты дзень яшчэ доўга ў залах музея гучалі віншаванні і прывітанні, словы ўдзячнасці і захаплення, пажаданні росквіту. А музей рыхтаваўся да наступнай урачыстасці — прыёму былых супрацоўнікаў музея, якія на працягу 35 гадоў збіралі калекцыю, — сваімі творчымі праектамі, працай і дасягненнямі генеравалі і крышталізавалі ідэю стварэння экспазіцыі маляванкі. Тым самым спарадзіўшы ідэю *Музея*, дзе ў першую чаргу маюць прэзентавацца шчыры талент і самабытнасць беларускіх наіўных мастакоў, іх індывідуальнасці, выяўленыя ў маляванках.

*У гэты святочны дзень усе супрацоўнікі музея-запаведніка разам і поруч працавалі, каб зладзіць мерапрыемства такім урачыстым і радасным — навукова-экспазіцыйны аддзел, аддзелы фондаў і музейнай педагогікі, бухгалтэрыя і гаспадарчы аддзел. Нас таксама бязмежна падтрымалі сваёй дапамогай у супрацы кіраўніцтва, супрацоўнікі і творчыя калектывы Заслаўскай дзіцячай школы мастацтваў і Мінскага раённага цэнтра культуры, за што мы шчыра ўдзячныя ім ўсім — усім, хто прычыніўся да Свята Беларускай Маляванкі.*

*Ксенія Сямашка,*
*намеснік дырэктара па навуковай рабоце*

**Наша выстава: чарговы Праект у межах серыі “Этнаграфіка рэчавіду”**

З 30 мая ў нашым музейна-выставачным комплексе (*вул. Рынкавая, 4*) пачаў працу мемарыяльны выставачны праект “Камяні млынара. Вяртанне... З гісторыі сям'і Мяхедак-Савіцкіх – заслаўскіх млынароў і мінскіх майстроў ды каменацёсаў”. Ён прысвечаны памяці аб сям'і, якая валодала Заслаўскім паравым млыном, што ў наш час з'яўляецца галоўным аб'ектам этнаграфічнага комплекса музея-запаведніка. За сваё “музейнае” жыццё млын быў наведаны многімі тысячамі гасцей, якія на аснове экспазіцыі, абсталяванай у ім, даведваліся аб млынарскай справе. Служыць ён дадзенай асветніцкай мэце і цяпер. За часам сваёй непасрэднай працы па апрацоўцы ўраджаю (*зерня “завознікаў”*) млын змалоў велізарныя аб'ёмы мукі, нарыхтаваў безліч крупы, задавольваючы патрэбы местачковай, а пазней – і гарадской акругі.



*Фотаздымкі Ларысы Барташэвіч*

Непасрэдна паравым млыном у Заслаўі валодалі Ясон і яго сын Капітон Мяхедка-Савіцкія. Частка прадстаўнікоў роду Мяхедка-Савіцкіх асела ў Мінску – жылі на Старажоўскай вуліцы. Сын Ясона Ігнат (*Ігнацій*) займаўся цясаннем камянёў – рабіў помнікі для могілак. Помнікі, створаныя Ігнатам, стаяць на магіле яго маці Кацярыны (на старых могілках у Заслаўі), сустрэць іх можна і на Кальварыі ў Мінску. Памёр Ігнат Мяхедка-Савіцкі ў Мінску ў 1918 г. ад пошасці (эпідэміі), але нашчадкаў па сабе пакінуў. У ліку нашчадкаў Мяхедка-Савіцкіх, што жылі ў Мінску, была і Вера Мяхедка, якая

пазней па мужы стала насіць прозвішча Барташэвіч. А ў яе з мужам Сцяпанам была дачка Ларыса Барташэвіч – звернемся далей да згадкі менавіта аб ёй.

Дадзены выставачны праект стаў магчымым, дзякуючы дапамозе дачкі Ларысы Барташэвіч – Людмілы Паўлаўны Пятровай, якая беражліва захавала артэфакты і ўспаміны, звязаныя з гісторыяй яе сям'і: фотаздымкі, жывапісныя работы аўтарства сваёй маці і іншае. Таксама вялікую працу ў гэтай справе зрабілі сябры Людмілы Паўлаўны – Ганна і Уладзімір Ракіцкія, а таксама нашы супрацоўнікі – Ксенія Сямашка і Генадзь Сівохін. Больш падрабязна пра дзеянне дадзенага выставачнага праекта можна даведацца скарыстаўшыся наступнай спасылкай: http://museum.by/node/68905.

Шчыра запрашаем адведаць дадзены арыгінальны выставачны праект, каб пабачыць гісторыю заслаўскага млына праз прызму сямейнай гісторыі, праз прызму чалавечых лёсаў і стасункаў.



*Мастацкія работы Ларысы Барташэвіч*

## <u>*Навуковая праца*</u>

### Заслаўе ў беларускай культуры

Кожны горад Беларусі робіць свой пэўны ўнёсак у скарбонку Айчыннай гісторыі і культуры, кожны дадае як нешта агульнае, так і непаўторнае –

сваё. Асаблівае месца ў дадзеным рэчышчы адводзіцца асветніцкай справе, навочнаму раскрыццю гісторыі розных часоў для розных катэгорый насельніцтва. Надзвычай важным у такім выпадку з'яўляецца зварот да арыгінальных артэфактаў і помнікаў гісторыі, каштоўнасць якіх не выклікае сумненняў. Заслаўю, у асветніцкім аспекце, ёсць чым ганарыцца. Аспект гэты раскрываецца з дапамогай звароту да інтэрпрэтацыі шэрагу помнікаў даўніны. Гэта і старажытныя гарадзішчы “Замачак” (“Замэчак”) і “Вал” (Заслаўскі замак), старадаўні храм з высокай белай вежай, касцёл Найсвяцейшай Дзевы Марыі... Пералік можна працягваць і ў гэтым пераліку абавязкова трэба прыгадаць былы паравы млын у Заслаўі, які з'яўляецца помнікам прамысловай гісторыі XX ст. і ўваходзіць у склад гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе”.

Паравы млын у Заслаўі быў збудаваны на сродкі Ясона і Капітона Мяхедка-Савіцкіх у 1910 г. на Рынкавым пляцы. Пазней, у 1915 г. ён быў перавезены на новае месца, бліжэй да чыгункі, дзе і знаходзіцца да гэтай пары, стаўшы з 1990 г. жывым помнікам эпохі і млынарскай справы.



*Экскурсавод Барыс Пятровіч Харэвіч (“Млынар”)*
*на Заслаўскім млыне пры загрузцы мяхоў*

Быў час, калі паравыя млыны на Беларусі існавалі ў вялікай колькасці. Тычыцца гэта, галоўным чынам, першай паловы XX ст. Яны былі звычайнай

з'явай сваёй эпохі, прыкладам прамысловага прадпрыемства, адпаведнага тэхналогіям і часу. Пазней, больш за ўсё, яны мадэрнізаваліся шляхам усталявання больш дасканалага тыпу рухавіка – нафтавага або электрычнага. Такі кірунак мадэрнізацыі напаткаў і Заслаўскі млын. Аднак, гістарычны лёс быў літасцівы не да ўсіх млыноў: некаторыя з іх згарэлі, былі разабраны на будаўнічыя матэрыялы і дровы, закінуты. Пра многія млыны прамысловага тыпу засталіся толькі ўспаміны, не болей за то.

Млыну ў Заслаўі, у гэтым сэнсе, пашчасціла больш. Ён не толькі захаваўся цалкам, але і захаваў арыгінальныя механізмы, што выкарыстоўваліся для перапрацоўкі зерня на працягу ўсяго XX ст. Млыну ў Заслаўі выпала не толькі вялікае шчасце лёсу, але і вялікая праца і адказнасць – навочна распавесці аб сваіх “братах-млынах”, што не захаваліся да нашых дзён, адкрыць зацікаўленым сучаснікам асаблівасці прамысловай апрацоўкі зерня на муку і крупу, характэрнай для розных рэгіёнаў Беларусі, паяднноўаючы нас з сусветным працэсам індустрыяльнай вытворчасці, заснаванай на машынах-рухавіках. Каб пабачыць на ўласныя вочы гэту гістарычную і культурную каштоўнасць, госці мэтанакіравана прыязджаюць у Заслаўе з разнастайных куткоў нашай краіны, а часам – нават і з замежжа.



*Экскурсавод Барыс Пятровіч Харэвіч (“Млынар”)*
*на Заслаўскім млыне пры ліфтавым механізме*

Вядома, што ветраныя млыны (ветракі) ў Беларусі можна пабачыць і ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту ў Строчыцах, і ў Музейным комплексе старажытных народных рамёстваў “Дудуткі”. Пабачыць таксама можна і вадзяныя млыны, дзесьці – у захаваным стане, дзесьці – у закінутым. А вось захаваны паравы млын з арыгінальнымі механізмамі — гэта сапраўдны помнік гісторыі, фактычна адзіны ў сваім родзе для тэрыторыі Беларусі.

Такім чынам, Заслаўе робіць заўважны ўнёсак у справу захавання і трансляцыі гісторыі млынарскай справы Беларусі, здзяйсняючы гістарычную інтэрпрэтацыю Заслаўскага млына як арыгінальнага помніка, у межах экскурсійнай працы і індывідуальнага наведвання. Млыны ж, самі па сабе, гэта з'ява не толькі гістарычная, але і культурная, якая мае глыбокія карані ў традыцыйнай народнай культуры.

## *Да матэрыялаў канферэнцыі*

*Быў час, калі наш музей-запаведнік выступаў у якасці арганізатара і мадэратара канферэнцый. Яны адбываліся на працягу шэрагу гадоў. Ад іх працы захаваліся даволі цікавыя матэрыялы, якія друкаваліся ў спецыяльных зборніках. У гэтым нумары мы хочам Вам прапанаваць адзін з такіх матэрыялаў, які быў надрукаваны ў зборніку “Заслаўе. Карані нашага радаводу” ў 2011 г., па выніках канферэнцый, арганізаваных нашым музеем-запаведнікам. Звернемся да старадаўняй гісторыі Заслаўя, на аснове артыкула навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі* ***У.І. Пашкевіча****, які падаем галоўным чынам без змяненняў [апрача афармлення спасылак: зноскі пад тэкстам асобных старонак заменены квадратнымі дужкамі і спісам крыніц і літаратуры, змешчаным пры канцы артыкула; лічбы з дробных заменены дзесятковымі (з “коскай”); вымярэнні плошчы замест надрадковай лічбы “2” заменены спалучэннем “м.кв.”; таксама дададзены ілюстрацыі, падабраныя згодна са зместам]. Магчыма, калісьці традыцыя правядзення канферэнцый Заслаўскім музеем-запаведнікам адновіцца зноў [рэд.].*

## Заслаўе і яго жыхары паводле інвентара 1698 г.

З 1675 г. Заслаўе, якое з'яўлялася цэнтрам аднайменнага графства, належала буйному магнацкаму роду Сапегаў. Заслаўскае графства перайшло да іх згодна з пагадненнем, заключаным у Любчы паміж Сапегамі

і Агінскімі, паводле якога адбыўся падзел спадчыны віленскага ваяводы Ежы Караля Глябовіча [1]. Дзве яго дачкі, Хрысціна Барбара і Марцыбела, былі жонкамі адпаведна Казіміра Яна Сапегі, ваяводы полацкага, і Марцыяна Агінскага, ваяводы трокскага. Пасля смерці ў 1695 г. Хрысціны Барбары Глябовіч Заслаўскае графства, якое складала спадчыну маці, перайшло да яе старэйшага сына Ежы Станіслава Сапегі, стольніка ВКЛ *[Вялікага Княства Літоўскага – рэд.]*. На працягу амаль 100 гадоў (з 1675 па 1760) Сапегі валодалі Заслаўем і нават карысталіся тытулам “граф на Заслаўе”. Але сапраўднымі гаспадарамі тут былі арандатары і застаўнікі. Значныя грашовыя выдаткі, выкліканыя неабходнасцю падтрымання высокага сацыяльнага і палітычнага статусу ў грамадстве, прымушалі Сапегаў здаваць у арэнду ці закладаць (“пускаць у заставу”) частку сваіх маёнткаў, сярод якіх было і Заслаўскае графства. Інвентар Заслаўя 1698 г. быў складзены ў сувязі з перадачаю яго ў арэнду на пяць гадоў Яну Шрэтару, скарбніку ВКЛ [2]. Уся праца па складанню інвентара была выканана сапежынскім эканомам Ежы Марцінам Юрэвічам, падстоліем смаленскім.




Праца на сенажаці. Гравюра Аляксандра Тарасевіча “Ліпень”
з цыкла “Поры года”, 1678 г.

Гэты інвентар утрымлівае досыць разнастайныя і цікавыя звесткі аб жыхарах Заслаўя, іх занятках, гарадскіх вуліцах і пабудовах. Інвентар фіксуе колькасць сядзіб (“дымоў”), называе прозвішчы гаспадароў, дакладна адзначае памер падаткаў. Ёсць упамінанне пра замак, але без яго

апісання. Побач з замкам размяшчалася панская сядзіба, на апісанне якой звернута значная ўвага.

Паводле інвентара 1698 г., у Заслаўі налічвалася 88 сядзіб гараджан (“дымоў”) [3]. У гістарычнай літаратуры прынята лічыць, што на кожны дым у горадзе прыходзілася ў сярэднім 6 чалавек. Такім чынам, колькасць жыхароў Заслаўя ў той час складала прыкладна 500 – 550 чалавек. Цікава адзначыць, што ў інвентары Заслаўе згадваецца як “miasto” – горад, у пазнейшых дакументах часцей называецца мястэчкам. У канцы XVII ст. у Заслаўі былі чатыры вуліцы: Рыначная, Мінская, Ракаўская і Радашковіцкая. Рыначная плошча, якая традыцыйна была цэнтрам планіровачнай структуры беларускіх гарадоў, у інвентары 1698 г. не згадваецца.

Самай вялікай у горадзе была Мінская вуліца, на ёй налічвалася 38 дымоў (сядзіб гараджан). Тут, на ўсходнім баку вуліцы, знаходзілася яўрэйская “школа” (малітоўны дом – У.І.). На Ракаўскай вуліцы месцілася 29 сядзіб і на Радашковіцкай – 21. Мінская і Ракаўская былі забудаваны з двух бакоў. На чале мясцовай адміністрацыі стаяў войт. У канцы XVII ст. заслаўскім войтам быў Ян Васілеўскі, яго сядзіба знаходзілася на Ракаўскай вуліцы. На Рыначнай вуліцы сядзібы гараджан не згадваюцца. Паводле інвентара, “перад замкам ад вуліцы Рыначнай” знаходзіўся ўезд на панскую сядзібу [4].

Усе пабудовы панскай сядзібы апісваюцца ў інвентары вельмі падрабязна. Вялікі панскі дом быў драўляным, крыты дранкай і налічваў 7 пакояў. Усе памяшканні ацяпляліся печамі, аздобленымі паліванай кафляй зялёнага колеру. Падлога была з дошак. У вокнах шыбы мацаваліся з дапамогай волава. На тэрыторыі панскай сядзібы таксама знаходзіліся разнастайныя гаспадарчыя пабудовы: кухня, свіран, дзве стайні, адрына, лазня, бровар, піўніца (халодны будынак для захавання піва, віна, малака – У.І.). Усе гэтыя пабудовы былі драўляныя, крытыя гонтай ці дранкай, некаторыя мелі саламяныя дахі. Вакол панскай сядзібы быў драўляны плот з брамай. Акрамя таго, у інвентары згадваюцца дзве мураваныя піўніцы на тэрыторыі замка і два млыны. Вялікі млын “а двух колах з двума спускамі” знаходзіўся на р. Свіслачы, пры якім дзейнічаў тартак (майстэрня па распілоўцы бярвення), другі млын быў на р. Чарніцы.

Заняткі жыхароў Заслаўя былі даволі разнастайнымі. У інвентары згадваюцца 16 рамеснікаў 11 рамесных прафесій [5]. Сярод іх былі кавалі (4 чалавекі), ткачы (2), рыбакі (2), муляр, шавец, цясляр, млынар,ліннік (вырабляў канаты і вяроўкі), стэльмах (вырабляў калёсы і сані). Згадваюцца і даволі рэдкія прафесіі – пазументнік (вырабляў пазументы – шытую

золатам або срэбрам тасьму) і цырулік (хірург). Магчыма, гэта адно з самых ранніх сведчанняў аб прысутнасці ў Заслаўі кваліфікаванага ўрача. Сярод жыхароў названы яшчэ ляснічы, а таксама вазніца і пастух, якія абслугоўвалі патрэбы панскага двара. Згадваецца мясцовы арандатар, магчыма, заслаўскай карчмы яўрэй Гірш Берковіч, сядзіба якога знаходзілася на Ракаўскай вуліцы.




*Ворыва і сяўба. Гравюра Аляксандра Тарасевіча “Кастрычнік” з цыкла “Поры года”, 1678 г.*

Тэрыторыя Заслаўя была падзелена на асобныя ўчасткі – пляцы, на якіх месціліся сядзібы гараджан. Памеры пляцаў вымяраліся ў прэнтах (1 прэнт = 23,7 м.кв.) і былі прыкладна роўныя ў кожным горадзе або мястэчку. Паводле ўмоў трымання аселыя пляцы падзяляліся на цяглыя, кунічныя і яўрэйскія. Гаспадары цяглых пляцаў абавязаны былі адбываць паншчыну, а кунічных – плаціць чынш. Акрамя таго, былі пляцы прыёмныя, гуменныя і палявыя, якія знаходзіліся ў часовым карыстанні. У канцы XVII ст. у Заслаўі налічвалася 29 кунічных, 20 цяглых і 6 яўрэйскіх аселых пляцаў [6]. Яўрэі складалі каля 19 % жыхароў Заслаўя, ім належала 17 гарадскіх сядзіб, прычым яны займалі неабавязкова яўрэйскія пляцы. Размеркаванне пералічаных тыпаў пляцаў у горадзе было даволі нераўнамерным. Ракаўская вуліца вылучалася тым, што на ёй абсалютна пераважалі кунічныя пляцы. На Радашковіцкай вуліцы, наадварот, большасць складалі цяглыя пляцы, а на Мінскай іх суадносіны былі прыкладна роўнымі. У горадзе мелася таксама пэўная колькасць вольных і пустых пляцаў, пераважна на Мінскай і Ракаўскай вуліцах.

Большасць гаспадароў займалі па аднаму аселаму пляцу. Прыкладна кожны чацвёрты меў толькі 0,5 пляца. Па паўтара пляца займалі толькі войт і яўрэй-арандатар. Акрамя таго, больш за палову жыхароў Заслаўя яшчэ мелі ў карыстанні дадатковыя пляцы (прыёмныя, гуменныя, палявыя), а таксама дадатковыя больш дробныя ўчасткі (“прэнты”), памер якіх вагаўся ад 6 да 28 прэнтаў. Па даных на 1698 г., у Заслаўі налічвалася 23 прыёмных, 19,5 гуменных, 7,5 палявых пляца і дадатковых 417 прэнтаў (9883 м.кв.). Калі ўлічыць дадатковыя пляцы, атрымліваецца, што некаторыя жыхары Заслаўя карысталіся 2 альбо 3 і нават болей пляцамі, як, напрыклад, нейкі Эйзік Дубіна, які меў 3,5 аляца (1 цяглы, 1,5 прыёмных і 1 гуменны пляц).

Значную ролю ў жыцці гараджан адыгрывалі сельскагаспадарчыя заняткі. За выключэннем яўрэяў (17 сядзіб) амаль усе жыхары Заслаўя мелі надзелы ворыўнай зямлі, памеры якіх ваганіся ад 0,25 да 1 валокі (1 валока = 21,36 га). Абсалютную большасць (69 %) складалі надзелы ў 0,5 валокі [7]. Усяго ў карыстанні гараджан знаходзілася 13 валок ворыўнай зямлі (278 га).

Павіннасці жыхароў Заслаўя, якія яны выконвалі на карысць уладальніка графства, былі строга рэгламентаваны. Іх пералік утрымліваецца ў спецыяльным раздзеле інвентара, які меў назву “Устава” [8]. Павіннасці гараджан залежалі ад тыпу пляцаў, якімі яны карысталіся. З кожнага цяглага пляца трэба было адбываць паншчыну два дні на тыдзень, плаціць чынш у памеры 5 злотых і па чарзе даваць падводы да Мінска, Ракава і Радашковіч. Гаспадары кунічных пляцаў плацілі 12 злотых чыншу і былі вольнымі ад паншчыны і падвод. Яўрэі плацілі з пляца 7 злотых 15 грошай і таксама вызваляліся ад паншчыны і падвод. За кожны прыёмны пляц гараджане плацілі 2 злотых, палявы – 1 злоты, гуменны – 0,25 злотага. За кожную валоку ворыўнай зямлі неабходна было штогод плаціць 6 злотых. Дадаткова жыхары Заслаўя разам сплочвалі за гарадскі выган 8 злотых і сенажаць пад Рафалавічамі – 9 злотых. Пры гэтым ад гараджан патрабавалася выплочваць чынш выключна сярэбранай манетай, лічачы 1 талер роўны 6 злотым. Вольнымі ад выканання гэтых павіннасцей былі войт, млынар, рыбак, вазніца і яўрэй-арандатар.

Усе жыхары Заслаўя, акрамя вольных, абавязаны былі, калі гэта будзе неабходна, выходзіць на рамонт і насыпку грэбляў. Акрамя таго, цяглыя мяшчане павінны былі летам, да жніва, адпрацаваць 6 талок (па аднаму чалавеку з дыму). Цікава адзначыць, што адміністрацыя графства выдавала гараджанам квіты з адзнакаю таго, хто і якія падаткі выплаціў. За атрыманне гэтых квітоў гараджане плацілі так званае “ўпіснае”, памер якога залежаў ад сумы сплочаных падаткаў і складаў па 3 грошы ад капы (капа =

60 адзінак). Паводле інвентара 1698 г., агульная сума з падаткаў, якія жыхары Заслаўя абавязаны былі штогод выплочваць уладальніку графства, складала 624 злотых і 6,5 гроша [9].

### *Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры*

1. Sapiehowie: Materiały historyczno-genealogiczne i majątkowe. T.2. Petersburg, 1891. – S. 164.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), ф. 1774, воп. 1, спр. 140, арк. 1 – 26.
3. Там жа, арк. 4 – 7.
4. Там жа, арк. 7.
5. Падлічана па: НГАБ, ф. 1774, воп. 1, спр. 140, арк. 4 – 7.
6. Там жа, арк. 7.
7. Падлічана па: НГАБ, ф. 1774, воп. 1, спр. 140, арк. 4 – 7.
8. Там жа, арк. 8.
9. Там жа, арк. 7.

**Выданне не з'яўляецца камерцыйным:** распаўсюджваецца дармова (бясплатна) і выключна ў адукацыйных і асветніцкіх мэтах для знаёмства з працай і здабыткамі ДУ «ГКМЗ «Заслаўе».

**Газета «Заслаўскія зборы» існуе толькі ў электронным выглядзе**, з мэтай рэалізацыі шырокага доступу да яе матэрыялаў праз сетку «Інтэрнэт», а таксама – ашчаднага стаўлення да прыродных рэсурсаў.

**Рэдкалегія: Сямашка К.У., Арцем'ева І.Д., Пакінка А.В., Кандратовіч І.Г.**

**Рэгулярнасць:** газета выдаецца раз на месяц.